РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЛІПЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 130 (30518)

## ТАЛЕНТ І МАЙСТЭРСТВА — НАША МАРКА

ВІТРАЖЫ майстэрства

**На ўзровень прафтэхадукацыі ўступная кампанія пачалася з 15 чэрвеня, на ўзровень сярэдняй спецыяльнай — стартуе 18 ліпеня. Што выбраць?**



На якія спецыяльнасці традыцыйна самы высокі попыт, з-за чаго сціраюцца гендарныя межы паміж прафесіямі і дзе маладыя людзі могуць зарабіць больш за сваіх бацькоў, нават у статусе навучэнцаў, расказаў рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук Валерый ГАЛУБОЎСКІ.

### ЗАДАЧА — ПАДРЫХТОЎКА ЗАПАТРАБАВАНЫХ НА РЫНКУ ПРАЦЫ КАДРАЎ

***— Самы час маладым людзям вызначацца з выбарам будучай прафесіі. Раскажыце, чым сёння прывабны адукацыйны трэк, прапанаваны на ўзроўні прафтэхадукацыі (ПТА) і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (ССА)?***

— Усяго ў нас каля 290 устаноў, якія рэалізоўваюць праграмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Увогуле налічваецца больш за 67 тысяч навучэнцаў на ўзроўні ПТА па рабочых прафесіях і каля 120 тысяч — на ўзроўні ССА. Як правіла, на сярэднім спецыяльным узроўні атрымліваюць кваліфікацыю «тэхнік-будаўнік», напрыклад, тэхнік, механік і яшчэ 2-3 рабочыя прафесіі. У тэхніка-будаўніка як спецыяліста сярэдняга звяна і патэнцыяльнага майстра ўчастка могуць быць кваліфікацыі «тынкоўшчык-маляр»; у тэхніка-механіка могуць быць «слесар механазборачных работ», «слесар-рамонтнік». Яны тым і прывабныя, што выходзячы з гэтай сістэмы, умеюць і рукамі працаваць, і калі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — арганізаваць работу невялікіх груп людзей, калектываў на вытворчасці ў рэальным сектары.

СТАР. 5

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ХТО ЭФЕКТЫЎНА ПРАЦУЕ — ТОЙ ПРЫГОЖА АДПАЧЫВАЕ



Фота БелТА.

**З захаваннем традыцый і павагай да каранёў — кіраўнік дзяржавы разумее ўсю важнасць гэтых каштоўнасцей**

Круглы год Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка настройвае суайчыннікаў на тое, што расслабляцца нельга, трэба старанна і самааддана працаваць, каб выжыць у сучасных напружаных умовах. Але нават у шчыльным графіку кіраўніка дзяржавы, як і тысяч беларусаў, ёсць час, калі можна крыху адпачыць, запаволіцца, набрацца сіл і з новым імпэтам рухацца далей. Пачатак ліпеня — менавіта такі час. Краіна адсвяткавала Дзень Незалежнасці, адзвінеў мноствам галасоў і мелодый купальскі фестываль у Александрыі. Узняўся ў неба сцяг «Славянскага базару ў Віцебску», у чацвер увечары будзе яго афіцыйнае адкрыццё. І заўсёды разам з беларусамі — Прэзідэнт. «Без культурнай спадчыны няма гісторыі, дзяржаўнасці, народа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка на фестывалі ў Александрыі. Маючы на ўвазе і спадчыну, што засталася нам ад продкаў, і тую спадчыну, якая ствараецца для будучых пакаленняў сёння.

СТАР. 2

СЕЗОН

## НАРЫХТОЎКІ З УЛІКАМ ПОПЫТУ

**Гарачая пара для спажыўкааперацыі**

Сёлета плануецца павялічыць аб'ём нарыхтовак бульбы, а таксама садавіны і агародніны з улікам попыту мінулага года, паведаміла старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Інеса КАРАТКЕВІЧ. Па «другім хлебе» паказчык ужо на 40 % большы, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Нарыхтоўка ідзе апераджальнымі тэмпамі.

### КОШТ ПЫТАННЯ



У сярэднім у год Белспажыўсаюз нарыхтоўвае не менш як 13 тысяч тон бульбы.

— У нас ёсць уласныя сховішчы, дзе захоўваем ураджай увесь міжсезонны перыяд, — падкрэсліла старшыня праўлення. — Хачу адзначыць, што ў міжсезонне, у маі—чэрвені, бульба была ў магазінах райспажыўтаварыства. Нават назіраліся факты перакупу, калі ў сельскіх гандлёвых аб'ектах куплялі па некалькі мяшкоў бульбы, каб перапрадаваць на рынку.

Лішкі сельгаспрадукцыі прымае 771 стацыянарны прыёма-нарыхтоўчы пункт, 63 перасоўныя. Акрамя гэтага да нарыхтовак прыцягнуты гандлёвыя аб'екты. Штогод аб'ёмы нарыхтоўкі бульбы, агародніны павялічваюцца. А вось па дзікарослай прадукцыі аб'ёмы залежаць ад умоў надвор'я і іншых фактараў.

Плодаагароднінная прадукцыя прымаецца па наступных цэнах за кілаграм у залежнасці ад калібру, сорту, віду: бульба — 1,8-2,8 рубля, капуста белакачанная — 1-1,5 рубля, буракі — 2,7 рубля, морква — 2,5-3,5 рубля, цыбуля — 1,5-5 рублёў.

— Закупачныя цэны сфарміраваны такім чынам, каб мы ўклаліся ў рамкі гандлёвых надбавак і забяспечылі гранічныя рознічныя цэны ў нашых гандлёвых прадпрыемствах, — патлумачыла Інеса Караткевіч.

СТАР. 3

# НАТХНЕННЕ ПОЛЕМ

**Першыя героі сёлетняга жніва — хлебаробы-тысячнікі**



Сяргей ШАНТЫР.

Фота БелТА.




Уборачная кампанія толькі пачалася, а ўжо ёсць тыя, хто пераадолеў тысячны рубеж. На Гродзеншчыне і Міншчыне першых тысячнікаў віталі амаль адначасова.

**Першым тысячнікам сёлетняй уборачнай кампаніі ў Беларусі стаў Сяргей ШАНТЫР з Гродзеншчыны. Рэкардсмен працуе ў СВК «Гродзенскі». Дарэчы, яго леташняе дасягненне — 6800 тон збожжа.**

У працэсе ўборкі азімага ячменю ў гаспадарцы задзейнічаны тры камбайны. Усе яны працуюць спраўна, без збояў. Ураджай ячменю сёлета лепшы, чым летась, адзначаюць у «Гродзенскім». Тут стараюцца выкарыстоўваць насенне гэтай культуры першай рэпрадукцыі і элітнае. Агульная плошча пасеваў ячменю складае 120 гектараў.

Рубеж у тысячу тон Сяргей Шантыр пераадолеў усяго за чатыры дні, намалаціўшы ў сярэднім ад 200 да 260 тон за дзень. Аграрый ставіцца да сваёй працы з адказнасцю і адзначае, што адчувае дух саперніцтва:

— Не буду ўтойваць: ганаруся, што стаў першым. Віншаванні прымаць прыемна. Апроч уласнага жадання старанна працаваць, падганяе і канкурэнцыя, усе хочуць выкласціся напоўніцу, і я гэта адчуваю. З самага пачатку працы ў сельскагаспадарчай сферы ў мяне амаль усе ўборкі перадавыя. Летась вельмі добра папрацаваў, сёлета хачу адпрацаваць не горш.

Гаспадаркі вобласці настроены на сур'ёзную работу. Як адзначыў **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Ігар САРОКІН**, у рэгіёне добра падрыхтаваліся да жніва. Некаторыя раёны, напрыклад Гродзенскі і Бераставіцкі, ужо заканчваюць уборку азімага ячменю. У цэлым па вобласці ўбрана больш за 8 тысяч гектараў, што складае амаль чвэрць усіх палёў.

**А на Міншчыне ў адной гаспадарцы Клецкага раёна — адразу два тысячнікі: камбайнер ААТ «Кухчыцы» Павел ШУЦІЛА і Андрэй АЛЯКСЕЙЧЫК з гэтай жа гаспадаркі — ён стаў першым кіроўцам у краіне, які сёлета перавёз на сваім аўтамабілі «МАЗ» тысячу тон збожжа.**

У ААТ «Кухчыцы» сёлета пасеяна 460 гектараў азімага ячменю. Гэта аптымальная плошча, каб забяспечыць сваю жывёлагадоўлю фуражным збожжам, выканаць дзяржзаказ і закласці насенне для ўласных патрэб гаспадаркі.



Павел ШУЦІЛА і Андрэй АЛЯКСЕЙЧЫК.

Фота дадзена газетай «Да новых перамог».

«Убралі больш за 50 % азімага ячменю, намалочана крыху больш чым дзве тысячы тон збожжа, сярэдняя ўраджайнасць перавышае 80 цэнтнераў на гектар. Хацелася б, вядома, больш... Вясновыя замаразкі не лепшым чынам паўплывалі на пасевы. Але вынік усё ж годны», — паведаміў **дырэктар сельгаспрадпрыемства Сяргей ЗДРОК**.

Агульная ўборачная плошча да гэтага жніва складае больш за 1,5 тысячы гектараў. Для работы гаспадарка мае 9 камбайнаў, два з іх — новыя. Паводле слоў кіраўніка сельгаспрадпрыемства, гомельскія GS-2124 ні ў чым не саступаюць імпартным аналагам.

«Жніво — праверка для новай тэхнікі. І адзін з камбайнаў, які цяпер працуе на ўборцы ячменю, паказаў свае флагманскія магчымасці. За шэсць дзён жніва ў складаных умовах надвор'я механізатару Паўлу Шуцілу ўдалося намалаціць тысячу тон збожжа. Хоць адразу ж адзначу, што на такой тэхніцы ў нас працуюць майстры сваёй справы, яны выходзяць у лідары не першы год, прайшоўшы добрую механізатарскую школу. Гэта сапраўдныя прафесіяналы, патрыёты сваёй малой радзімы і краіны, на якіх трымаецца сельская гаспадарка», — расказаў Сяргей Здрок.

Ён таксама выказаў вялікую падзяку кіраўніцтву краіны за тое, што сёння вяскоўцы, адчуваючы падтрымку, у тым ліку і ў выглядзе тэхнічнага абсталявання, могуць не толькі паказваць высокія вынікі, але і добра зарабляць.

Яшчэ адзін тысячны вынік па стане на 9 ліпеня зафіксаваў кіроўца аўтамабіля МАЗ-555 Андрэй Аляксейчык. «Летась за сезон ён перавёз больш за 5 тысяч тон збожжа — гэта быў найлепшы вынік у вобласці! І сёлета здаваць пазіцыі перадавіка Андрэй не плануе», — адзначыў кіраўнік гаспадаркі. У 2025 годзе ў ААТ «Кухчыцы» планы на ўраджай нядрэнныя. «Спадзяёмся, што вынік восенню пакажам годны», — рэзюмаваў Сяргей Здрок.

«Гэтыя дасягненні — не проста лічбы. А вынік карпатлівай працы, самаадачы і аддданасці зямлі, — віншуючы аграрыяў, адзначыў **старшыня Клецкага райвыканкама Юрый КАРЛОВІЧ**. — У кожным каласку, у кожнай тоне збожжа і перавезенага грузу — часцінка душы гэтых людзей, іх вопыт і майстэрства. Такія работнікі — залаты фонд аграпрамысловага комплексу, прыклад для пераймання, гонар усёй Мінскай вобласці і краіны».

***Новыя рэкорды не за гарамі. Уборачная кампанія ў самым разгары, і ў палях кіпіць работа. Механізатары і вадзіцелі, аграномы і інжынеры — усе, хто мае дачыненне да жніва, імкнуцца ўнесці свой уклад у агульны поспех. Кожны дзень прыносіць новыя перамогі, і імёны перадавікоў будуць гучаць усё гучней.***

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫЯ!

## «ПІСЬМЫ ШЧАСЦЯ», ДЫ НЕ ТЫЯ

**З'явілася новая схема махлярства**



Ашуканцы прыдумляюць усё новыя схемы «разводу» даверлівых грамадзян. Гэтым разам узяліся за аўтамабілістаў. Як расказалі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, у пачатку ліпеня пачасціліся выпадкі фэйкавых паведамленняў пра штрафы за парушэнні Правіл дарожнага руху. Аўтаўладальнікам у месенджарах Viber, Telegram і іншых прыходзяць паведамленні быццам ад Дзяржаўтаінспекцыі. У тэкстах указаны дакладныя прозвішча, імя і імя па бацьку кіроўцы, нумар пастановы, сума штрафу і рэквізіты для пераводу на абазначаны рахунак.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# ХТО ЭФЕКТЫЎНА ПРАЦУЕ — ТОЙ ПРЫГОЖА АДПАЧЫВАЕ

## ПАМЯЦЬ, ЯКАЯ НЕ ЗГАСАЕ

На мінулым тыдні, прысвечаным Дню Незалежнасці, Прэзідэнт шмат казаў не толькі аб тым, якой цаной дасталася нам незалежнасць, але і аб тым, без чаго яе ў прынцыпе быць не можа. Традыцыі, захаванне гістарычнай спадчыны, памяць аб мінулым і вывучаныя ўрокі гісторыі. «Мір, свабода і незалежнасць — гэта наша спадчына і найвялікшыя каштоўнасці, якія трэба берагчы і абавязкова абараняць. Трэба ўмацоўваць народнае адзінства, эканоміку і абарону нашай Айчыны. Кожны дзень, кожную гадзіну. У гэтым абавязак сучаснікаў перад мінулым і будучым, каб жыла і квітнела наша любімая Беларусь!» — звярнуўся да землякоў беларускі лідар, выступаючы на Кургане Славы на мерапрыемстве, прымеркаваным да Дня Незалежнасці. Тое, што галоўнае свята краіны Прэзідэнт сустракае на Кургане Славы, — вельмі знакава. Як вядома, гэта месца не адзін дзясятак гадоў сімвалізуе памяць аб велічным подзвігу продкаў, якая не згасае.

Помнікаў у краіне створана нямала. Аднак людзі імкнуцца захаваць кожны факт, кожнае гераічнае прозвішча і данесці ўсё гэта да наступных пакаленняў. Сведчаннем стаў музей Славы Магілёўшчыны, які быў адкрыты кіраўніком дзяржавы адразу пасля Дня Незалежнасці. Музей, стварэнне якога ініцыявалі неабыякавыя беларусы, пабудаваны на легендарным месцы — Буйніцкім полі, якое, як і Курган Славы, не адзін дзясятак гадоў захоўвае памяць аб трыумфе салдацкай мужнасці, як пісаў Канстанцін Сіманаў. Але новаму пакаленню патрэбны новыя формы. Таму сутнасць у новага музея тая ж (у нашай краіне не можа быць ніякай варыятыўнасці, калі размова ідзе пра гістарычную праўду), а формы новыя — інтэрактыўныя, з прымяненнем сучасных тэхналогій. Як заўважыў Прэзідэнт, у залах музея ажывае і гаворыць галасамі герояў тысячагадовая гісторыя краю. А гісторыя ў Магілёўшчыны сапраўды надзвычай насычаная, і самая гераічная яе старонка, канешне, — Вялікая Айчынная вайна, дзе быў зроблены адзін з першых вялікіх крокаў да знішчэння фашысцкай навалы.



**Вадзім ГІГІН, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў,** нагадаў, што Магілёўская абарона 1941 года стала першай такога роду аперацыяй у гады Вялікай Айчыннай вайны і адной з першых за ўсю Другую сусветную вайну. «Проста дзіўна і трохі крыўдна, што ў савецкі час гораду не прысвоілі геройскае званне, якое ён па праве заслужыў. Затое ў 1980 годзе Магілёў узнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны І ступені. Менавіта пад яго стылізаваны новы музей Славы Магілёўшчыны. А ўжо ў нашы дні Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2009 года Магілёў быў узнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны», — дадаў парламентарый.

Размаўляючы з жыхарамі Магілёва на адкрыцці музея, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ні ў якім разе нельга губляць гэтую гісторыю, традыцыі, прынцыпы. Найперш каб не прайграць вайну за розумы нашых людзей.

## АДЛЮСТРАВАННЕ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Найлепшы ўзор захавання сваіх традыцый і павагі да мінулага — традыцыйнае свята «Купалле» ў Александрыі. Яно вядомае таксама пад назвай «Александрыя збірае сяброў», што сапраўды так: сёлета фестываль наведалі больш за 115 тысяч чалавек. Кіраўнік дзяржавы не раз прызнаваўся, што ў гэтым месцы, на гэтым свяце ён адпачывае душой. Шматлікія госці фестывалю могуць лёгка падпісацца пад гэтымі словам. Свята ў Александрыі ўвасабляе тое, што блізка і зразумела кожнаму: нашы вытокі, культуру, традыцыі. А гэта, як заўважыў Прэзідэнт, аснова асноў, наша душа, без гэтага няма гісторыі, няма дзяржаўнасці, няма народа. Аляксандр Лукашэнка расказаў і пра новы сімвал фестывалю — адноўленую паромную пераправу цераз Днепр, якая аб'ядноўвала Аршанскі і Шклоўскі раёны. Кіраўнік дзяржавы паглядзеў глыбей і заўважыў, што такія пераправы аб'ядноўваюць людзей і эпохі.



Фота БелТА.



А «Купалле» ў Александрыі сапраўды аб'ядноўвае народы, заўважыў **Аляксандр ГАРОШКІН, член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі.** «Рэспубліканскае свята «Купалле» ўжо даўно стала візіткай Беларусі, падзеяй, якую з нецярпеннем чакаюць не толькі жыхары краіны, але і госці з-за мяжы. Гэты фестываль, што праходзіць на малой радзіме Прэзідэнта, заслужана заваяваў любоў і прызнанне, стаўшы яркім адлюстраваннем багатай культурнай спадчыны, самабытнай народнай культуры, гасціннай душы і таленту майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Магілёўшчыны. Свята ў Александрыі — гэта не толькі беларускае свята, але і пляцоўка для міжнароднага культурнага абмену. Сёлета ў фестывалі прынялі ўдзел 29 рэгіёнаў Расіі, што сведчыць аб моцных культурных сувязях паміж нашымі краінамі. Характэрна, што Башкартастан, Сахалін і Амурская вобласць упершыню прыехалі на свята, што сведчыць аб росце папулярнасці фестывалю і яго прывабнасці для рэгіёнаў, якія імкнуцца прадставіць сваю культуру і наладзіць новыя кантакты. Фестываль — падзея, якая пакідае незабыўныя ўражанні і прымушае ганарыцца сваёй краінай і яе багатай спадчынай», — падкрэсліў сенатар.



**Губернатар Бранскай вобласці Аляксандр БАГАМАЗ** прызнаўся журналістам, што кожны год імкнецца наведаць свята ў Александрыі: вельмі падабаецца атмасфера гэтага фестывалю і разам з тым — яго магчымасці. «Мы абмеркавалі ў тым ліку эканамічнае супрацоўніцтва паміж нашымі рэгіёнамі. Пагаварылі пра тыя праекты, якія ў нас сёння працуюць. Гэта сумесныя вытворчасці па выпуску камбайнаў. Развіццё ёсць і ў іншых сферах, як у эканамічнай, так і ў гуманітарнай, таксама развіваем навуку і спорт. Жыццё ідзе, і мы з аптымізмам глядзім у будучыню», — падкрэсліў ён. Сапраўды, нашы людзі ўмеюць і адпачываць, і працаваць — з усім спраўляцца.

## СВЯТА ТРАДЫЦЫЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

Самы красамоўны прыклад народнай, нават святочнай дыпламатыі — Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар» у Віцебску. Яго знакамітыя на ўвесь свет пазыўныя ўжо некалькі дзён гучаць у горадзе на Дзвіне. «Гэты фестываль аб'ядноўвае людзей розных пакаленняў, рэлігій і культур — сапраўдных знаўцаў мастацтва з самымі рознымі захапленнямі: ад авангарда да класікі. Але галоўнае — ён стаў сапраўды сямейным святам, святам традыцыйных каштоўнасцяў», — адзначаў Прэзідэнт на адкрыцці «Славянскага базару» летась. З 1995 года фестываль пад асабістым патранажам Аляксандра Лукашэнкі. Дзякуючы менавіта яго асабістаму ўдзелу фестываль атрымаў пастаянную прапіску ў Віцебску, што надало яму той самы непаўторны стыль і каларыт.



Выпадкова, але так важна, што свята з Александрыі плаўна пераязджае ў Віцебск. Лакацыі розныя, але ж сутнасць адна — нязменная і шчырая. «Фестываль «Александрыя збірае сяброў», заснаваны на старажытнаславянскіх купальскіх абрадах, мае вялікае значэнне. У нас гэта свята захавалася ў першапачатковым выглядзе і з'яўляецца сёння адным з адметных рыс беларускай нацыянальнай культуры. Таму правядзенне купальскіх дзён у Александрыі — гэта ўжо частка нашага культурнага кода», — заявіў у ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **дэкан факультэта журналістыкі БДУ палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ.** Па яго словах, «Славянскі базар у Віцебску», безумоўна, таксама важны. Гэта — фестываль славянскіх культур, дзе прадстаўлена не толькі песня, але і іншыя віды мастацтваў — тэатральная творчасць, харэаграфія, рукадзелле, рамёствы, музей пад адкрытым небам, дзіцячыя выступленні — уся духоўная спадчына народаў.

* * *

Нягледзячы на вельмі шчыльны графік, кіраўнік дзяржавы заўсёды наведвае святы ў Александрыі і Віцебску. І гэта таксама вельмі кранальная і вельмі важная традыцыя. А без традыцый немагчыма развіваць эканоміку, мадэрнізаваць абараназдольнасць, удасканальваць сацыяльную сферу. Ды і ці трэба, бо хто мы без традыцый?

**Валерыя СЦЯЦКО.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПА СУТНАСЦІ

# НА БАЦЬКОЎСКІМ БЕРАЗЕ



Беларусы — людзі сонца. Зараз мы ў яго промнях. Літаральна — неба не чарнее ад выбухаў, сонца не засцілаюць ад нас лятучыя забойцы. Мір, у Беларусі — мір. Таму самы час на спевы. Як і заўжды, Александрыя збірае сяброў. Гэта не толькі назва свята, гэта больш пра жыццёвую філасофію. На берагах Дняпра спрадвеку збіраліся славяне. Гандлявалі. Сябравалі. І нават хрысціліся.

Александрыя — гэта напамін пра адвечныя каштоўнасці. Паважаць працу. Хлеб надзённы і духоўны. А яшчэ разуменне — ад чужога не насыцішся. Вось дзе павінны славяне дамаўляцца аб міры. Не ў далёкім Стамбуле, а тут, на берагах Дняпра. І купальскае вогнішча Александрыі — той векапомны арыенцір, напамін аб сяброўстве.

Гэта і культурны код продкаў, павага да роднай зямлі, да малой радзімы — галоўная магія беларускага Купалля. Знітавана песня з адстойваннем права жыць на сваёй зямлі. Пагадзіцеся, вельмі ж сімвалічна, што дата галоўнага дзяржаўнага свята — Дня Незалежнасці — суседнічае ў календары са святам у Александрыі.

Егіпецкая Александрыя была адным з ключавых цэнтраў антычнага свету. Ва ўсходніх славян з'явілася свая. Шклоўская Александрыя. І тут без пераборшанняў. І легенд пра папараць-кветку. Рэальнасць драматычная. І ад яе не захінешся легендарнай кветкай. Але вось якраз сваю веру і культуру, свае легенды ды паданні час адстойваць. Такое яно, мультыкультурнае жыццё — папярэднік «постчалавецтва». Свята адно, а сутнасць шматгранная. Любоў да роднай зямлі — ці не з гэтага пачынаецца Бацькаўшчына? Гэта пункт апоры і насамрэч месца сілы. І хто яго не страціў, той ніколі не стане слугой чужых інтарэсаў. Хто не забыў звон касы па ранішняй расе, хто босымі нагамі адчувае кожны каменьчык на сцежцы да дзедавай крыніцы, той ніколі не здрадзіць сабе, сваім ідэалам і сваёй Радзіме. Наш Прэзідэнт не здрадзіць. Пасля вялікіх самітаў — на падзарадку — ён заўжды імкнецца на малую радзіму.

«Александрыя» не проста грандыёзнае свята. Гэта маяк памяці. Маяк вернасці роду, сям'і, Бацькаўшчыне. Нельга аддаляцца ад прыроды і роднай зямлі. Ніякай палітыкі. Накшталт азвярэлых «зялёных», таксічных грынпісаў і іншых НКА. Трэба проста памятаць пра Купалле ў беларускай Александрыі. Гэта філасофія жыцця. Калі людзі побач, калі ўсе яны блізкія да сваіх каранёў і традыцый, тады і радуюцца.

Не тое што тыя замежныя «настаўнікі свету», якія паблыталі берагі. Не збіцца з курсу нам дапамагаюць агні купальскіх вогнішчаў Александрыі. Як можа быць у чалавека інакш, калі ў яго сэрцы жыве агонь любові і памяці аб родным доме. Ці не гэта — тая самая папараць-кветка? Мы яе знайшлі. Яна квітнее на родных абшарах. Мы моцна трымаем яе ў руках, бо спрабуюць жа вырваць сілы зла. І гэта ўжо зусім не легенда. Але канец цёмных сіл прадвызначаны. Іх час — да з'яўлення сонца праўды на ўсходзе. А світанне — гэта заўжды прыгожа і сімвалічна. Сонца купаецца, грае ў водах велічнага Дняпра. Вось яна, глыбокая плынь роднасных сэнсаў бацькоўскага берага.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

АКТУАЛЬНА

# РУХ У ПРАВІЛЬНЫМ НАПРАМКУ

**Урад унёс важныя змены ў нарматыўна-прававую базу ў сферы ўвозу і эксплуатацыі транспартных сродкаў на тэрыторыі краіны**

Адпаведную пастанову падпісаў Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН, паведамілі ў прэс-службе Саўміна.

У прыватнасці, унесена карэкціроўка дзейных часовых асаблівасцяў правядзення ацэнкі адпаведнасці транспартных сродкаў, якая прадугледжвае для юрыдычных асоб максімальную колькасць колавых транспартных сродкаў, што ўвозяцца ў Беларусь з трэціх краін на працягу года, з рухавікамі ўнутранага згарання і электрарухавікамі аднаго тыпу без атрымання адабрэння тыпу транспартнага сродку.

Пры гэтым змены не закранаюць машыны, якія ўвозяцца фізічнымі асобамі для асабістага карыстання, растлумачылі ва ўрадзе.

На думку аўтараў дакумента, гэта мера дасць магчымасць стварыць умовы для бяспечнага абарачэння электрамабіляў у нашай краіне, аналагічныя ўмовам дзяржаў — членаў ЕАЭС, а таксама будзе садзейнічаць насычэнню рынку прадукцыяй, якая адпавядае патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза.

— Пры гэтым для павольнага пераходу дылерскіх кампаній да вядзення бізнесу з улікам новых патрабаванняў па атрыманні ў краіне сертыфікатаў бяспекі для транспартных сродкаў у дачыненні да электрамабіляў устаноўлены пераходны перыяд, які прадугледжвае ўвядзенне патрабаванняў па атрыманні адабрэння тыпу транспартнага сродку для такіх машын пачынаючы з 1 студзеня 2026 года, — адзначылі ў Савеце Міністраў.

Як пракаментавалі ў Міністэрстве прамысловасці пастанову ўрада, перадумовамі яе прыняцця стала неабходнасць абароны рынку ЕАЭС ад абарачэння на яго тэрыторыі небяспечнай прадукцыі, а таксама забеспячэнне для выробленай у Беларусі і імпартаванай у краіну тэхнікі з аналагічнымі ўмовамі доступу на ўнутраны аўтамабільны рынак. Сярод перадумоў акрамя таго былі прапановы па паляпшэнні ўмоў гаспадарання, пазначаныя членамі Рэспубліканскай асацыяцыі прадпрыемстваў прамысловасці БелАПП.

У профільным міністэрстве звярнулі ўвагу на тое, што пастановай не прадугледжваецца ўвядзенне дадатковых мер нетарыфнага рэгулявання, якія абмяжоўваюць унутраны рынак Беларусі.

— Дадзеным нарматыўным прававым актам карэкціруецца ўжо дзеючы ў краіне механізм рэалізацыі часовых (да 31 снежня 2027 года) патрабаванняў і парадку правядзення ацэнкі адпаведнасці асобных колавых транспартных сродкаў, — запэўнілі ў ведамстве.

У прыватнасці, дакумент дае магчымасць юрыдычным асобам увозіць з трэціх краін на працягу каляндарнага года пэўную колькасць колавых транспартных сродкаў аднаго тыпу без неабходнасці атрымання адабрэння тыпу транспартнага сродку (АТТС) — дакумента, які пацвярджае адпаведнасць патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Еўразійскага эканамічнага саюза ў дачыненні да колавых транспартных сродкаў.



У Міністэрстве прамысловасці выказалі ўпэўненасць, што гэта мера створыць умовы для насычэння рынку бяспечнымі і экалагічна чыстымі сучаснымі машынамі.

— Асаблівае значэнне мае ўвядзенне для бізнесу «пераходнага» перыяду, што забяспечыць дылерскім кампаніям магчымасць адаптаваць сваю дзейнасць да новых патрабаванняў па атрыманні дакументаў аб ацэнцы адпаведнасці патрабаванням бяспекі, у тым ліку для электрамабіляў, забяспечыць плаўны пераход да больш строгіх патрабаванняў да ажыццяўлення ацэнкі адпаведнасці ў цэлым усіх транспартных сродкаў, што, безумоўна, павысіць узровень бяспекі прадукцыі на ўнутраным рынку, — падкрэслілі ў Мінпраме.

Такім чынам, адзначылі тут, уводныя меры не будуць выкарыстоўвацца ў бягучым годзе ў дачыненні да электрамабіляў.

На думку профільнага ведамства, перавагі гэтай пастановы відавочныя. У іх ліку — стварэнне ўмоў для бяспечнага абарачэння электрамабіляў на тэрыторыі нашай краіны, абумоўленых неабходнасцю адпаведнасці міжнародным тэндэнцыям і патрабаванням ЕАЭС. Сярод прыярытэтаў і ўрэгуляванне працэдуры ўвозу транспартных сродкаў для юрыдычных асоб, што спрыяе развіццю бізнесу і стымуляванню інвестыцый, а таксама павышэнне ўзроўню экалагічнай бяспекі за кошт павелічэння долі электрамабіляў на рынку. Апроч іншага, плюсам з'яўляецца і забеспячэнне гарманізацыі патрабаванняў з тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза «Аб бяспецы колавых транспартных сродкаў».

— Пры гэтым змены не закранаюць машыны, якія ўвозяцца фізічнымі асобамі для асабістага карыстання, — акцэнтавалі ўвагу ў Міністэрстве прамысловасці.

У завяршэнне тут адзначылі, што ведамства працягне работу па развіцці інавацыйных тэхналогій і стварэнні ўмоў для ўстойлівага развіцця аўтамабільнай галіны ў нашай краіне:

— Меры, якія прымаюцца, накіраваны ў першую чаргу на ўмацаванне пазіцый Рэспублікі Беларусь як сучаснага і бяспечнага цэнтра аўтамабільнай прамысловасці.


Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет повторных электронных торгов, назначенных на 22.07.2025**

**Лот № 1: Цех подсобных промыслов** (инв. № 420/С-101787**, 206,7 кв. м).** Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Огородники, ул. Новая, 1Г**. ***Сведения о земельном участке:*** **пл. 0,0252 га,** предоставлен на праве аренды до 08.11.2071 для строительства и обслуживания здания цеха подсобных промыслов

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 28 874,22 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 2: Здание бани** (инвен. №: 430/С-61953, **45,2 кв. м).** Адрес: **Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 50, здание бани юго-западнее д. Василевичи.** ***Сведения о земельном участке:*** **пл. 0,0691 га,** предоставлен на праве аренды по 29.07.2072 для строительства и обслуживания здания бани. Ограничения (обременения): придорожная полоса (контролируемая зона) автомоб. дорог

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 462,84 бел. руб.** (снижена на 20 %)

Предыдущая публикация извещения по лотам №№ 1, 2 – в газете «Звязда» 06.06.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов** по лотам №№ 1, 2: **22.07.2025** с 11.00 до 12.00. Заявки на участие в электронных торгах по лотам №№ 1, 2 принимаются по **21.07.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги»

**Предмет электронных торгов, назначенных на 12.08.2025**

**Лот № 3: Здание административное** (инв. № 420/С-47480**, 727,2 кв. м,** составные части: подвал, проходная) **и туи западные** (2 шт.). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, 28.** ***Сведения о земельном участке:*** **пл. 0,1288 га,** предоставлен на праве аренды до 23.12.2074 для строительства и обслуживания администр. здания

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 1 628 847,07 бел. руб.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов** по лоту № 3: **12.08.2025** с 11.00 до 12.00. Заявки на участие в электронных торгах по лоту № 3 принимаются по **11.08.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги»

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет покупатель

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере по лот № 1 – 6 %, по лоту № 2 – 10 %, по лоту № 3 – 2 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) по поручению **государственного предприятия «Минский областной технопарк»** (продавец, место нахождения: Смолевичский район, д. Станок Водица, ул. Заводская, 1),

проводит повторный открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: Ленточнопильный станок Pegas 360*500 GH-LR, 2011 г. в., серийный № 3600221001, инв. № по бух. учету 631. Начальная цена с НДС (20 %) – 25 542,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **2 554,00 бел. руб.**

**Лот № 2: Токарно-винторезный станок ГС526У-01, 2009 г. в., заводской № 365, инв. № по бух. учету 607. Начальная цена с НДС (20 %) – 23 100,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **2 310,00 бел. руб.**

**Лот № 3: Токарно-винторезный станок ГС526У-01, 2009 г. в., заводской № 372, инв. № по бух. учету 608. Начальная цена с НДС (20 %) – 24 618,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **2 461,00 бел. руб.**

**Лот № 4: Универсальный фрезерный станок ОРША-Ф32 У.31, 2009 г. в., заводской № 72, инв. № по бух. учету 311. Начальная цена с НДС (20 %) – 62 106,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **6 210,00 бел. руб.**

**Стоимость лотов снижена на 45 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.04.2025, 21.05.2025, 13.06.2025.

Электронные торги состоятся **24.07.2025** в **10.00** на torgi.rlt.by.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.07.2025** до **17.00.**

**Тел. организатора торгов: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: (8029) 700-22-11.**

УНП 600017416



Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Могилевский лесхоз, г. Могилев, ул. Крупской, 140. УНП 700336549 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by. |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машина погрузочно-транспортная МПТ-461.1, (в составе с **трактором «Беларус-82.2»**, рег. № ТВ-6 1648, зав. № 172001952, 2012 г. в. и **полуприцепом ПЛ-9**, рег. № БЮ 3372, зав. № 1002 (0450), 2013 г. в.) | 36 360,00 |
| 2 | **Прицеп специальный ПС-30,** рег. № ТВ-6 8135, зав. № 053, 2012 г. в. | 14 400,00 |
| 3 | **Грузовой лесовоз УРАЛ 4320,** рег. № ТВ 1654, кузов № 012183, 1982 г. в. | 6 552,00 |
| 4 | **Трактор «Беларус 892.2»,** рег. № ІВ-6 3376, зав. № 90827961, 2014 г. в. | 11 736,00 |

**Местонахождение – г. Могилев, ул. Крупской, 140**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 25.07.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.07.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by)

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by

# НАРЫХТОЎКІ З УЛІКАМ ПОПЫТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## АДПАВЯДАЦЬ ЗАПЫТАМ СПАЖЫЎЦОЎ

Магазіны спажыўкааперацыі працуюць пераважна ў сельскай мясцовасці, у 23 тысячах населеных пунктах Беларусі. Рознічны гандаль ажыццяўляецца як праз 4 тысячы стацыянарных гандлёвых аб'ектаў, так і праз аўтакрамы. Апошніх ездзіць па вёсках Беларусі амаль паўтысячы, за год яны пераадольваюць каля 14 мільёнаў кіламетраў. Аднак працуе Белкаапсаюз і ў сферы грамадскага харчавання, прамысловасці, нарыхтоўкі. У сістэме каля 300 вытворчых цэхаў і ўчасткаў, якія вырабляюць харчовую і нехарчовую прадукцыю. Гэта хлебазаводы, мясаперапрацоўчыя, кандытарскія цэхі.

— Мы павінны павышаць прэстыжнасць сістэмы. Ідзе работа па мадэрнізацыі, адкрываюцца новыя аб'екты гандлю і грамадскага харчавання. Стараемся адпавядаць запытам спажыўцоў, — заўважыла Інеса Караткевіч.

Аўтакрамы спажыўкааперацыі абслугоўваюць 13 800 населеных пунктаў, прычым амаль 6 тысяч — з насельніцтвам да 10 чалавек.

— Мы выконваем задачы, якія ставіць кіраўнік дзяржавы: незалежна ад таго, колькі ў вёсцы жыве чалавек, мы павінны даехаць і даязджаем да кожнага, нягледзячы на надвор'е і іншыя ўмовы. Аўтакрамы аснашчаны спадарожнікавай навігацыяй, што дазваляе адсочваць маршрут іх руху. Працуе кантакт-цэнтр, і жыхары могуць замаўляць любы від тавару гаспадарчай ці будаўнічай групы, складаную бытавую тэхніку, якія дастаўляюцца па месцы прызначэння, — падкрэсліла Інеса Караткевіч. — Больш за тое, дзейнічае падпісанае з МАРГ пагадненне аб зніжках уразлівым катэгорыям грамадзян. Увогуле, пятую частку такіх зніжак сярод гандлёвых арганізацый дае якраз Белкаапсаюз.

## «КУПАВЫ» І «МАНДАРЫНЫ»

Белкаапсаюз абнаўляе і парк аўтакрамаў. У адпаведнасці з Указам «Аб падтрымцы арганізацый спажывецкай кааперацыі» ад 5 жніўня 2024 года на працягу трох гадоў арганізацыя атрымае 240 новых аўтамагазінаў, якія адпавядаюць усім тэхнічным, тэхналагічным і санітарным патрабаванням. Акрамя мадэляў, якія добра зарэкамендавалі сябе, спецыялісты таксама вывучылі навінкі, прадстаўленыя на «Белагра». На пэўных маршрутах могуць з'явіцца больш мабільныя аўтакрамы «Мандарын».

Белкаапсаюз да 1 ліпеня завяршыў аўтаматызацыю сістэмы ўліку руху тавараў, фінансавых патокаў, замяніўшы касавае абсталяванне ва ўсіх аўтакрамах і стацыянарных аб'ектах у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства. Праводзіцца навучанне супрацоўнікаў. Такія меры дазволяць павысіць якасць абслугоўвання насельніцтва, асабліва ў глыбінцы, забяспечыўшы даступнасць тавараў і паслуг.

**Алена КРАВЕЦ.**

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

# СВЯТЛО ПЕРСПЕКТЫВЫ

### Як «Адзін раён — адзін праект» дапамагае ў вытворчасці інавацыйнай прадукцыі

Мінулы год для ААТ «ЭНЭФ», што ў Маладзечне, вызначыўся асаблівым дасягненнем — быў адкрыты новы цэх з сучасным абсталяваннем у рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект», якую ініцыяваў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Прадпрыемства спецыялізуецца на выпуску святлодыёдных свяцільнікаў, а таксама рэцыркулятараў паветра, якія карысталіся асаблівым попытам у перыяд пандэміі, і прыбораў для ўльтрафіялетавага абеззаражвання вады. Дарэчы, іх цяпер выкарыстоўваюць у артэзіянскім водазабеспячэнні сталіцы. Сярод іншых кірункаў — асвятленне ў транспарце. Больш падрабязна з этапамі іх вытворчасці і кантролем за якасцю вырашылі азнаёміцца карэспандэнты «Звязды».

## 1,3 ТЫСЯЧЫ МЕТРАЎ КВАДРАТНЫХ

Гэткую плошчу займае той самы новы цэх, у якім па чарзе па дзве змены працуюць 27 чалавек — чатыры брыгады. Як расказала дырэктар прадпрыемства Наталля ГАЛОТА, новая пляцоўка была асвоена за ўласныя сродкі на агульную суму каля 4,5 мільёна рублёў: «У 2020 годзе стала зразумела, што неабходна павялічваць плошчы вытворчасці, паколькі прадпрыемства паступова развіваецца. Звярнуліся да Аляксандра Турчына (тады ён займаў пасаду старшыні Мінскага аблвыканкама. — **«Зв.»**) з просьбай дапамагчы ў набыцці пляцоўкі, размешчанай побач з асноўным корпусам. Дзякуючы яго падтрымцы, удалося рэалізаваць задуманае».



Цікава, што з 2022 года «ЭНЭФ» таксама з'яўляецца часткай Нацыянальнага тэхнапарка — прадпрыемства пастаянна ўдасканальвае прадукцыю, робіць акцэнт на інавацыі. Тут вырабляюцца, напрыклад, святлодыёдныя модулі для велікагрузнай тэхнікі. «Дзякуючы гэтаму мы атрымалі льготы, а на сэканомленыя сродкі ўдалося набыць найноўшае абсталяванне», — паведаміла дырэктар.

Кірункаў дзейнасці ў прадпрыемства сапраўды шмат: выраб асвятляльнага абсталявання для аўтобусаў і тралейбусаў, электробусаў, для рухомых саставаў электрацягнікоў і цягнікоў метрапалітэна. Новыя саставы метро, якія прыбылі з Мыцішчаў, таксама аснашчаны асвятляльным абсталяваннем прадпрыемства.

Асаблівасць прадукцыі, што выпускаецца, — імпартазамяшчэнне. Вырабы не саступаюць па якасці вядомым сусветным брэндам. Гэта цэняць пакупнікі і ў Беларусі, і ў Расіі, і ў іншых краінах.



**Намеснік галоўнага канструктара Аляксандр ЖУКОЎСКІ** працуе тут каля 15 гадоў. Ён расказаў, што вытворчасць пастаянна ўдасканальваецца, а наменклатура і тэхналогіі мадэрнізуюцца. Гэта асабліва важна ў век лічбавых тэхналогій: «Пасля спынення паставак некаторых кампанентаў з Еўропы ў многіх прадпрыемстваў узнікла патрэба імпартазамяшчэння. Старыя вырабы пераводзілі на новую элементную базу. Гэта насамрэч вялікая работа. У ліку імпартазамяшчальных тавараў быў цікавы праект па вырабе альтэрнатывы прылады па абеззаражванні вады. Спецыяльная распрацоўка мела на мэце забяспечыць заказчыку поўную ўзаемазамяняльнасць іншага абсталявання, устаноўленага на станцыях ачысткі сцёкавых вод».

## НАЗІРАЕМ ЗА ВЫТВОРЧАСЦЮ

Пачынаем знаёмства з новым цэхам. Суправаджаць і расказваць пра тонкасці работы пагадзіўся **начальнік вытворчасці Аляксей ВЕРАМЕЙ.** «Тут размяшчаецца ўчастак зборкі свяцільнікаў рознага прызначэння: вулічных, аўтамабільных, для памяшканняў. Пераважна спецыялізуемся на вырабе для іх электронных кампанентаў і карпусных дэталяў», — расказаў суразмоўца.

Ён таксама паведаміў, што для ўстанаўлення на плату неабходных SMD-кампанентаў (рэзістараў, мікрасхем, святлодыёдаў, стабілітронаў і іншых, якія ўстанаўліваюцца з дапамогай тэхналогіі паверхневага мантажу) існуе пэўны вытворчы цыкл: спачатку наносіцца паяльная паста, пасля гэтага робат устанаўлівае кампаненты і замацоўвае іх. Дарэчы, у гэтым цэху дзве цалкам аўтаматычныя лініі. Тут таксама існуе двухэтапны кантроль якасці: візуальны і электратэхнічны. **Галоўны тэхнолаг Максім БЯЗЗУБІН**, які пачынаў свой прафесійны шлях менавіта ў гэтым цэху, паведаміў, што кантроль якасці і зніжэння дэфектнасці прадукцыі — прыярытэтная задача: «Калі якасць паяння задавальняе, усе кампаненты прымацаваліся ў неабходным месцы, выраб перадаецца далей. Адмываецца ён шляхам акунання ва ўльтрагукавую ванну — там абястлушчваецца, чысціцца. Усё, можна лічыць, прадукцыя гатовая да здачы заказчыку. Калі не — вяртаецца на дапрацоўку. Для нас важна ўмацоўваць канкурэнтныя пазіцыі ў галіне распрацоўкі святлотэхнічнай прадукцыі».

## ВАЖНЫ — КОЖНЫ

Далей трапляем на ўчастак нарыхтоўкі і зборкі, дзе працуюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Гэтай катэгорыі работнікаў, а таксама моладзі ўдзяляецца асаблівая ўвага. **Зборшчык радыёэлектроннай апаратуры і прыбораў Сяргей САКАЛОЎСКІ** дрэнна чуе, аднак гэта не з'яўляецца перашкодай для выканання абавязкаў на належным узроўні — ён займаецца зборкай вырабаў, якія прымяняюцца ў абсталяванні для абеззаражвання паветра і вады, асвятлення памяшканняў: «Працую пяць гадоў на прадпрыемстве і адчуваю, што патрэбны», — расказаў мужчына.

Тут жа сустрэлі **слесара-зборшчыка Андрэя СТАНКЕВІЧА:** «Добра зарэкамендаваў сябе на вытворчай практыцы падчас вучобы ў каледжы, пасля службы ў арміі таксама прыйшоў сюды — спадабалася», — падзяліўся малады чалавек.

Напрыканцы мы трапілі ў аддзел тэхнічнага кантролю. «Фінальны этап праверкі прадукцыі праводзіцца менавіта тут, — адзначыў начальнік вытворчасці. — Даследуем яе на адпаведнасць тэхнічным патрабаванням, стандартам, а таксама на адсутнасць памылак і дэфектаў, перадаём на ўпакоўку».

Але гэта далёка не ўсе ўчасткі — ёсць яшчэ мантажны і механічны цэхі, участак вытворчасці матковых вырабаў, а таксама рэгуліроўкі. На ўсіх робяць агульную справу — якасную прадукцыю, якая адпавядае патрэбам сучаснага айчыннага і замежнага рынкаў.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ

# ПАЗНАЁМІЦЦА З КУЛЬТУРАЙ, ТРАДЫЦЫЯМІ І ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАСЯБРАВАЦЬ

### Чым быў адметны Дзень Беларусі падчас форуму «Дзеці Садружнасці»

У рамках Міжнароднага культурна-адукацыйнага форуму «Дзеці Садружнасці» ў сераду прайшоў Дзень Беларусі. Удзельнікаў праекта, а гэта амаль сотня школьнікаў, чакала займальнае падарожжа і своеасаблівая прэзентацыя нашай краіны.

Пачалася яна ў экскурсійна-турыстычным комплексе «Аптэкарскі сад». Тут прадстаўлена больш за 200 відаў разнастайных раслін, нават тыя, што занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Удзельнікі форуму ўбачылі дрэва, лісцем якога сілкаваліся яшчэ дыназаўры. У праграме экскурсіі і розныя старабеларускія абрады. Сярод іх — рытуал выгнання злых духаў з дапамогай галінкі палыну.

А яшчэ ўдзельнікі форуму пабывалі на займальнай экскурсіі ў Нацыянальным парку «Нарачанскі», загадалі самыя запаветныя жаданні на беразе возера Нарач, наведалі этнакультурны турыстычны комплекс «Наносы», дзе ім расказалі пра жыццё і побыт беларусаў мінулага стагоддзя. Маладыя людзі спявалі народныя песні, вучыліся танцам.



**Удзельнік форуму з Расіі Даніяр Купроў** падзяліўся ўражаннямі: «Мне цікава даведацца, як жывуць людзі, якія найбліжэй да нас не толькі ў геаграфічным плане, але і ў культурным. Я займаюся танцамі, нават ведаю беларускі «Гусачок». Мне цікава ўбачыць іншыя беларускія танцы, а таксама песні і традыцыі».

**Удзельніца форуму з Туркменістана Лачын Качаманава** прызналася, што ў Беларусі ёй падабаецца ўсё. «Дзякуй вялікі за такую гасціннасць! Нас сустрэлі добра, мы вельмі рады гэтаму», — выказала захапленне дзяўчына.

Такім жа меркаваннем падзялілася і **ўдзельніца форуму з Туркменістана Айджаджэк Гурбаназарава.** Паводле слоў дзяўчыны, у Беларусі іх прынялі як родных: «Мы знайшлі тут шмат сяброў, абмяняліся тэлефонамі. Спадзяюся, што будзем камунікаваць нават пасля форуму. У вашай краіне вельмі прыгожая прырода, свежае паветра... Карацей, у Беларусі ўсім вельмі падабаецца».

Вядома, знаёмствам з нашай багатай прыродай і традыцыямі гэты дзень не абмежаваўся удзельнікаў форуму чакала «Сустрэча без гальштукаў». Дыскусійная пляцоўка дала магчымасць жадаючым асабіста пагутарыць з кіраўнікамі міністэрстваў і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. А ўвечары — культурна-адукацыйная праграма. Прэзентацыю нашай краіны прадставіла беларуская дэлегацыя.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота тэлеграм-канала Савета Рэспублікі.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинский льнозавод» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** административно-бытовой корпус общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **176 633,73 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **17 663,00 бел. руб.**

**Лот № 2:** здание котельной общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655 и кастросборник, общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **117 784,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **11 778,00 бел. руб.**

**Лот № 3:** навесной склад общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.
Начальная цена с НДС (20 %) – **55 701,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **5 570,00 бел. руб.**

**Лот № 4:** насосная станция 2-го подъема общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **33 895,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **3 389,00 бел. руб.**

**Лот № 5:** шоха № 1 общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2, общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653 и подвальное помещение, общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенные по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **286 237,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **28 623,00 бел. руб.**

**Стоимость лотов №№ 1–5 снижена на 55 %.**

**Лот № 6:** изолированное помещение (производственное помещение) общей площадью 3297,6 кв. м, инв. № 611/D-14597, расположенное по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60/1-2.
Начальная цена с НДС (20 %) – **328 800,00 бел. руб**.
Задаток 10 % от начальной цены – **32 880,00 бел. руб.**

**Лот № 7:** изолированное помещение (производственное помещение) общей площадью 102,9 кв. м, инв. № 611/D-14598, расположенное по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60/1-3.
Начальная цена с НДС (20 %) – **18 960,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **1 896,00 бел. руб.**

**Лот № 8:** склад с инв. № 611/С-40041 общей площадью 136,6 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60/11.
Начальная цена с НДС (20 %) – **13 716,00 бел. руб.**
